**Віталь Гарматны**
(Баранавічы)

# Верасень 1939 года ў лёсе беларускага народа

Пасля падпісання Рыжскай мірнай дамовы 18 сакавіка 1921 г. каля паловы беларускіх зямель (113 тыс. км$^2$) было ўключана ў склад Польскай дзяржавы (II Рэчы Паспалітай), дзе яны і заставаліся да верасня 1939 г. Сярод польскіх і беларускіх гісторыкаў ідуць вострыя дыскусіі наконт становішча заходнебеларускіх зямель у акрэслены перыяд. Калі раней беларускія гісторыкі адназначна называлі Заходнюю Беларусь „калоніяй Польшчы", аграрна-сыравінным прыдаткам і крыніцаю таннай рабочай сілы, падкрэслівалі яе сацыяльна-эканамічную адсталасць у параўнанні з карэннай Польшчай, то зараз многія сучасныя беларускія гісторыкі паказваюць і станоўчыя моманты ў гісторыі Заходняй Беларусі ў 1921-1939 гг., асабліва пры параўнанні яе становішча з тагачаснай Савецкай Беларуссю (Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікай, БССР)[1].

Як трапна адзначыў вядомы сучасны польскі даследчык гісторыі „Крэсаў Усходніх" Ян Ежы Мілеўскі: „Многія ацэнкі савецкай гістарыяграфіі патрабуюць пераасэнсавання, бо яны даваліся пад моцным націскам палітыкі. Польшча не была маці для беларусаў, хутчэй яна была мачахай, але і Сталін не быў для БССР бацькам. Перад беларускімі гісторыкамі стаіць вельмі важная задача — даць беларускую нацыянальную ацэнку гісторыі Заходняй Беларусі пад уладай Польшчы"[2].

Несумненным застаецца адно — разарванасць беларускага народа на працягу больш дваццаці гадоў значна замарудзіла развіццё культуры і мовы беларускага народа, паклала адбітак на рысы нацыянальнага характару.

Спрыяльныя ўмовы дзеля далейшага аб'яднання беларускага народа ў межах адной дзяржавы склаліся напрыканцы лета 1939 г. — пасля няўдалых савецка-англа-французскіх перамоў Іосіф Сталін змяніў знешнепалітычны курс і пайшоў на падпісанне ў ноч з 23 на 24 жніўня 1939 г. у Маскве савецка-германскай дамовы аб ненападзе („пакта Молатава-

[1] С. Кобяк, А. Мацко, *Нелёгкая дорога к единению*, „Беларуская думка", 1999, № 8, с. 87-88; А. Смалянчук, *Верасень 1939 г. у беларускай і савецкай гістарыяграфіі*, „Гістарычны альманах", 2000, т. 3, с. 78-79.

[2] Я. Е. Милевский, *К вопросу о состоянии исследования северо-восточных окраинных земель Второй Польской Республики (Западная Белоруссия)*, [у:] *Гістарычная навука і гістарычная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь*, ч. 1, Мінск 1994, с. 190.



*Падпісанне пакта Молатава-Рыбентропа, ноч з 23 на 24 жніўня 1939 г.*

Рыбентропа")[3]. Згодна сакрэтнай частцы гэтай дамовы заходнебеларускія і заходнеўкраінскія землі, якія знаходзіліся пад уладай Польшчы, трапілі ў сферу савецкага ўплыву[4].

Далейшыя падзеі развіваліся вельмі імкліва. 1 верасня 1939 г. нямецкія войскі без аб'яўлення вайны ўварваліся ў Польшчу з сушы, паветра і мора. Савецкае кіраўніцтва заняло пазіцыю чакання, а Вялікабрытанія і Францыя 3 верасня аб'явілі вайну Германіі, але баявых дзеянняў фактычна не вялі, таму Другая сусветная вайна (1939-1945 гг.) першапачаткова атрымала назву „дзіўная" ці „прывідная"[5].

Падчас вераснёўскай кампаніі 1939 г. колькасць беларусаў у Войску Польскім павялічылася не менш чым у чатыры разы ў параўнанні з міжваенным часам, і дасягнула найвышэйшай колькасці за ўвесь перыяд існавання ўзброеных сіл II Рэчы Паспалітай. Паводле меркаванняў вядомага даследчыка Юрыя Грыбоўскага ў вераснёўскай кампаніі ўдзельнічала не менш 70 000 польскіх грамадзян беларускага паходжання[6] (сярод іх быў будучы знакаміты беларускі пісьменнік Янка Брыль).

6 верасня 1939 г. у СССР праведзены быў частковы прызыў запаснікоў ва ўзброеныя сілы. Трэба адзначыць, што сімпатыі многіх простых савецкіх людзей былі на баку Польшчы, якая вяла няроўную барацьбу з нацысцкай Германіяй — Канстанцін Сіманаў успамінаў: „Калі пачалася вайна немцаў з Польшчай, усе мае спачуванні, таксама, як і спачуванні маіх таварышаў па рэдакцыі вайсковай газеты, дзе мы разам працавалі, былі на баку палякаў, таму што мацнейшы напаў на слабейшага (...) а хто ж з нас жадаў перамогі фашысцкай Германіі ў еўрапей-

[3] І. Басюк, *„Вялікім" закон не пісаны: Беларусь у планах пакта Рыбентропа-Молатава*, „Беларуская думка", 1994, № 2, с. 64; Л. Бибик, С. Третьяк, *Воссоединение Белоруссии*, „Армия", 1999, № 4, с. 33; Я. С. Павлов, *„Болевые точки" истории Беларуси (из научного наследия)*, Минск 1997, с. 81-82.

[4] А. Вабішчэвіч, *Уз'яднанне*, „Полымя", 2000, № 9, с. 186; У. Ладысеў, *Аб'яднанне беларускай нацыі (да 65-годдзя ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР)*, „Беларускі гістарычны часопіс", 2004, № 9, с. 5.

[5] М. Семаковіч, *Нарыс гісторыі Польскай Дзяржавы і Народа*, Варшава 2005, с. 223-225.

[6] Ю. Грыбоўскі, *Беларусы ў польскіх рэгулярных вайсковых фарміраваннях 1918-1945 гадоў*, Санкт-Пецярбург 2006, с. 159-160.

скай вайне, якая распачалася?"[7].

11 верасня 1939 г. Сталін аддаў загад аб стварэнні Украінскага і Беларускага франтоў і аб забароне публікацыі даных пра выпуск прадукцыі ў розных галінах прамысловасці і пра транспартныя перавозкі[8]. Савецкае кіраўніцтва рыхтавалася да вайны з Польшчай, але не жадала выглядаць у вачах сусветнай грамадскасці саюзнікам гітлераўскай Германіі і таму чакала, пакуль польскія войскі не будуць канчаткова разбіты вермахтам[9].

Нарэшце 17 верасня 1939 г. намеснік народнага камісара замежных спраў Савецкага Саюза Уладзімір Пацёмкін перадаў польскаму паслу ў Маскве Вацлаву Гжыбоўскаму ноту савецкага ўрада, у якой сцвярджалася, што Польская дзяржава фактычна не існуе і „Польшча стала спрыяльным полем для ўсялякага роду выпадковасцей і нечаканасцей, якія могуць стварыць пагрозу для СССР. Таму, будучы да гэтага часу нейтральным, Савецкі ўрад не можа болей індыферэнтна адносіцца да гэтых фактаў"[10].

Польскі пасол, як сапраўдны абаронца інтарэсаў сваёй Радзімы, ноту не прыняў і патрыятычна заявіў: „Суверэннасць дзяржавы існуе да таго часу, пакуль змагаюцца салдаты рэгулярнай арміі"[11], але савецкае кіраўніцтва лічыла зусім інакш і аддало часткам Чырвонай Арміі загад перайсці савецка-польскую мяжу і „ўзяць пад абарону жыццё і маёмасць насельніцтва Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі"[12].

Ранкам гэтага ж дня ў прамове па радыё наркам замежных спраў СССР Вячаслаў Молатаў падрабязна інфармаваў сваіх суграмадзян пра абставіны мінулай ночы, абверг чуткі пра магчымую вайну і ўводзіны картачнай сістэмы на прадукты і прамысловыя тавары, заклікаў насельніцтва „сумленна і самаадданна працаваць на сваіх пастах і тым самым аказваць дапамогу Чырвонай Арміі", а яе байцоў і камандзіраў — выканаць свой абавязак перад Радзімай „з гонарам і пашанаю"[13].

Па логіцы Крамля, калі Польская дзяржава фактычна спыніла існаванне, то аўтаматычна страчвалі сілу Рыжскі мір 1921 г. і Савецка-польская дамова аб ненападзе 1932 г., але ў гэты час яшчэ абаранялася Варшава і змагалася польская армія[14]. Акрамя таго, міжнароднае права не

[7] М. Шумейка, *Уз'яднанне: верасень 1939 г. у лёсе беларускага народа*, [у:] *Актуальныя пытанні гісторыі БССР: савецкі перыяд*, Мінск 1991, с. 104-105.

[8] У. Ладысеў, *Ваенныя падзеі верасня 1939 г. у лёсе беларускага народа*, „Беларускі гістарычны часопіс", 1999, № 3, с. 5.

[9] *Беларусь на мяжы тысячагоддзяў*, рэд. І. Хаўратовіч, Мінск 2000, с. 176.

[10] Я. Павлов, *„Болевые точки" истории Беларуси*, с. 71; М. Шумейка, *Уз'яднанне: верасень 1939 г. ...*, с. 105.

[11] А. Вабішчэвіч, *Уз'яднанне*, „Полымя", 2000, № 9, с. 190.

[12] М. Шумейка, *Уз'яднанне: верасень 1939 г. ...*, с. 105.

[13] Л. Бибик, С. Третьяк, *Воссоединение Белоруссии*, „Армия", 1999, № 5, с. 24-25.

[14] Г. Розанов, *Сталин — Гитлер. Документальный очерк советско-германских дип-*



*Сустрэча чырвонаармейцаў з жыхарамі Заходняй Беларусі*

прызнае знікненне дзяржавы, калі існуюць яе вышэйшыя органы, якія ажыццяўляюць дзяржаўны суверэнітэт у эміграцыі, як гэта склалася потым з польскім урадам. Такім чынам, Савецкі Саюз вайны Польшчы не аб'яўляў, але распачаў „вызваленчы паход" з мэтаю далучэння заходнеўкраінскіх і заходнебеларускіх зямель[15].

Паход распачаўся 17 верасня 1939 г. (у нядзелю) у 5 гадзін 40 хвілін (па іншых звестках у 5 гадзін) раніцы, калі войскі Украінскага фронту пад камандаваннем камандарма 1-га ранга Сямёна Цімашэнкі і Беларускага на чале з камандармам 2-га ранга Міхаілам Кавалёвым, агульнаю колькасцю каля 600 000 чалавек, перайшлі савецка-польскую мяжу[16].

Беларускі фронт налічваў прыкладна 200 800 салдат і афіцэраў, якім супрацьстаялі 45 000 палякаў, з якіх прыкладна палова не была ўзброена і не ўваходзіла ў вайсковыя адзінкі. Уздоўж мяжы з БССР тонкаю рысаю размяшчаліся польскія памежнікі колькасцю каля 2 000 чалавек. Такім чынам, сур'ёзнай вайсковай сілы, якая магла паспяхова супрацьстаяць савецкім і нямецкім войскам, у палякаў не было[17].

Галоўная роля на Беларускім фронце савецкім урадам надавалася

*ломатических отношений. 1939-1941 гг.*, Москва 1991, с. 117.

[15] І. Басюк, *„Вялікім" закон не пісаны: Беларусь у планах пакта Рыбентропа-Молатава*, „Беларуская думка", 1994, № 2, с. 65; М. Семаковіч, *Нарыс гісторыі Польскай Дзяржавы і Народа*, с. 226.

[16] С. Кобяк, А. Мацко, *Нелёгкая дорога к единению*, „Беларуская думка", 1999, № 8, с. 95; Я. Павлов, *„Болевые точки" истории Беларуси*, с. 73.

[17] У. Ладысеў, *Ваенныя падзеі верасня 1939 г. у лёсе беларускага народа*, „Бела-

3-й арміі, якая рухалася з раёна Полацка на Вільню, 4-й арміі — з Слуцка на Брэст і конна-механізаванай групе Івана Болдзіна з раёна Мінска на Гродна і Беласток. Аператыўную падтрымку наступаючым войскам аказвалі памежнікі[18].


*Сумесны парад нямецкіх і савецкіх войск у Брэсце, 22 верасня 1939 г.*

Неабходна адзначыць, што напярэдадні ўступлення Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь савецкія салдаты атрымалі падрабязныя інструкцыі як сябе паводзіць. На ўсе пытанні мясцовага насельніцтва яны павінны былі адказваць: „У нас ёсць усё", „у нас гэтага шмат", „мы гэта вырабляем на фабрыках". Па некаторых звестках салдаты і афіцэры атрымалі грашовае забеспячэнне на тры месяцы наперад, таму прыклады марадзёрства і рабаўніцтва з боку салдат Чырвонай Арміі былі даволі рэдкай з'явай[19].

„Вызваленчы паход" Чырвонай Арміі адрозніваўся шэрагам асаблівасцей: суцэльнай лініі фронту не было, а чырвонаармейцам забаранялася распачынаць авіяцыйную і артылерыйскую бамбардзіроўку населеных пунктаў і весці баявыя дзеянні супраць польскіх войск, якія не аказваюць супраціву. Асабоваму складу растлумачвалася, што войскі прыйшлі ў Заходнюю Украіну і Заходнюю Беларусь „не як заваёўнікі, а як вызваліцелі (...) украінскіх і беларускіх братоў (...) ад усялякага прыгнёту і эксплуатацыі, ад улады памешчыкаў і капіталістаў". Войскам прадпісвалася „дзейнічаць рашуча і прасоўвацца хутка", пры сустрэчы з нямецкімі войскамі не даваць ім падстаў для правакацый, не дапускаць захопу немцамі зямель, населеных беларусамі і ўкраінцамі. Пры спробе ж асобных нямецкіх частак, нягледзячы ні на што, уступаць з імі ў бой і аказваць гітлераўцам рашучы адпор[20].

У загадзе Галоўнакамандуючага польскімі войскамі Эдварда Рыдз-Сміглага ад 17 верасня 1939 г. салдатам і афіцэрам Польшчы забаранялася ўступаць у баі з савецкімі часткамі за выключэннем спроб раззбраення ці відавочных баявых дзеянняў. Камандзіры польскіх частак

рускі гістарычны часопіс", 1999, № 3, с. 6.

[18] Л. Бибик, С. Третьяк, *Воссоединение Белоруссии*, „Армия", 1999, № 5, с. 25.

[19] *Гісторыя Беларусі:* у 6 т., т. 5: *Беларусь у 1917-1945*, Мінск 2006, с. 454.

[20] Л. Бибик, С. Третьяк, *Воссоединение Белоруссии*, „Армия", 1999, № 5, с. 25.



*Сустрэчы савецкіх і нямецкіх жаўнераў, 1939 г., Заходняя Беларусь*

павінны былі весці перамовы з савецкімі афіцэрамі „з мэтаю вываду гарнізонаў у Румынію і Венгрыю”[21].

Часткі Чырвонай Арміі таксама не імкнуліся да ўзброеных сутыкненняў з польскаю арміяй. Як пісаў начальнік Генеральнага штаба Войска Польскага генерал Вацлаў Стахевіч, польскія часткі былі „дэзарыентаваны паводзінамі бальшавікоў, таму што яны ў асноўным пазбягаюць адкрываць агонь, а іх камандзіры сцвярджаюць, што яны прыйшлі на дапамогу Польшчы супраць немцаў (...). Савецкія салдаты ў масе сваёй не страляюць, да нашых адносяцца з дэманстратыўнаю сімпатыяй, частуюць папяросамі і г.д., усюды паўтараюць, што ідуць на дапамогу Польшчы”[22].

Асноўная частка насельніцтва Заходняй Беларусі сустракала Чырвоную Армію як вызваліцельніцу, нярэдка з кветкамі і хлебам-соллю. Насцярожана ўспрымалі прыход новай улады заможная частка грамадства і інтэлігенцыя, якая ведала пра трагічныя падзеі 1930-х гг. у БССР, звязаныя з барацьбою з „нацдэмаўшчынай” і калектывізацыяй[23].

[21] А. Вабішчэвіч, *Уз'яднанне*, „Полымя”, 2000, № 9, с. 190; У. Ладысеў, *Ваенныя падзеі верасня 1939 г. у лёсе беларускага народа*, „Беларускі гістарычны часопіс”, 1999, № 3, с. 6.

[22] Я. Павлов, *„Болевые точки” истории Беларуси*, с. 73-74; Г. Розанов, *Сталин — Гитлер. Документальный очерк...*, с. 118.

[23] С. Кобяк, А. Мацко, *Нелёгкая дорога к единению*, „Беларуская думка”, 1999, № 8, с. 95.

Яшчэ да прыходу савецкіх войск у шэрагу населеных пунктаў рабочыя і сяляне пад кіраўніцтвам былых членаў Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі (КПЗБ) стваралі ўзброеныя атрады, раззбройвалі паліцыю, жандармерыю, асаднікаў, бралі ўладу ў свае рукі. Сялянскія камітэты дзялілі паміж бяднейшымі сялянамі былую памешчыцкую, асадніцкую і царкоўныя землі, бралі на ўлік маёмасць, інвентар, жывёлу і запасы збожжа ў маёнтках[24].

Малазямельныя і беззямельныя сяляне атрымалі ў гэты час ад улад каля 431 000 гектараў ворнай зямлі, 14 000 коней і 33 400 кароў, насенне і г.д. бясплатна[25]. У вёсцы ліквідавалася памешчыцкае землеўладанне, такім чынам палепшылася матэрыяльнае становішча сялян. Паўсюдна праходзілі стыхійныя мітынгі ў падтрымку „вызваленчага паходу" і ствараліся органы савецкай улады — Часовыя ўправы, якія сталі цэнтрамі палітычнага, гаспадарчага і культурнага жыцця краю; пры іх ствараліся атрады рабочай гвардыі. На фабрыках і камітэтах ствараліся камітэты рабочага кантролю[26].

Польскія часткі часцей за ўсё здаваліся без бою, але назіраліся і ўзброеныя сутычкі паміж савецкімі і польскімі часткамі, асабліва ўпарта трымаліся салдаты польскага корпуса аховы памежжа. Ужо 17 верасня распачаўся бой на поўнач ад чыгуначнай станцыі Стоўбцы. Пры падыходзе Чырвонай Арміі да Навагрудка там разгарэўся жорсткі начны бой паміж прыхільнікамі Савецкай улады і польскімі салдатамі.

17 верасня 1939 г. савецкія войскі занялі Баранавічы, Маладзечна, 18 — Слонім, Навагрудак, Ліду, Ваўкавыск, 19 — пасля двухгадзіннага бою — Вільню, а таксама Пружаны, Кобрын, 21 — Пінск, 22 — Брэст і Беласток і г.д.[27] Узброеныя сутыкненні паміж „Саветамі" і палякамі адбываліся 20-21 верасня ў Гродне (15-ты танкавы корпус страціў тут 4 танкі і 1 бронемашыну спаленымі і 12 танкаў і 2 бронемашыны падбітымі, людскія страты склалі 47 чалавек забітымі і 156 параненымі)[28] і Скідалі, упарта змагалася Брэсцкая крэпасць, але кардынальна сітуацыю гэта не магло змяніць.

22 (у некаторых крыніцах 25) верасня 1939 г. нямецкі генерал Гайнц Гудэрыян і савецкі камбрыг Сямён Крывашэін прынялі на галоўнай

[24] М. Жылінскі, *Савецка-германскія адносіны напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны*, [у:] *Оборонительные бои на территории Беларуси. Республиканская научно-практическая конференция, посвящённая 65-летию обороны г. Могилёва от немецко-фашистских захватчиков (29-30 июня 2006 г.): материалы конференции*, Могилёв 2006, с. 7.

[25] *Беларусь на мяжы тысячагоддзяў*, с. 177.

[26] Я. Павлов, *„Болевые точки" истории Беларуси*, с. 73.

[27] А. Вабішчэвіч, *Уз'яднанне*, „Полымя", 2000, № 9, с. 190-191.

[28] *Беларусь на мяжы тысячагоддзяў*, с. 176.

вуліцы Брэста сумесны парад германскіх і савецкіх войск, пасля чаго савецкія часткі былі адведзены за Буг. Да 25 верасня Чырвоная Армія паспяхова скончыла свой паход.

Нягледзячы на адсутнасць маштабных баявых дзеянняў паміж Чырвонай Арміяй і польскімі фарміраваннямі, страты войск Беларускага і Украінскага франтоў былі даволі значнымі. Паводле новых даных, якія таксама патрабуюць удакладнення, яны склалі 951 чалавек забітымі і 2002 параненымі. У перыяд з 17 па 30 верасня савецкія войскі ўзялі ў палон і абяззброілі (дакладней, інтэрніравалі) 60 202 польскіх вайскоўцаў[29].

**Страты Чырвонай Арміі падчас заходняга паходу (17-25 верасня 1939 г.)[30]**

| Віды страт | | камандзіры | малодшыя камандзіры | салдаты | разам |
|---|---|---|---|---|---|
| Загінула | Украінскі фронт | 50 | 87 | 354 | 491 |
| | Беларускі фронт | 32 | 63 | 221 | 316 |
| Знікла без звестак | Украінскі фронт | 19 | 18 | 104 | 141 |
| | Беларускі фронт | 1 | — | 2 | 3 |
| Разам | Украінскі фронт | 69 | 105 | 458 | 632 |
| | Беларускі фронт | 33 | 63 | 223 | 319 |
| | разам | 102 | 168 | 681 | 951 |

5 кастрычніка 1939 г. па ініцыятыве Часовага ўрада Беластока ў Заходняй Беларусі разгарнулася выбарчая кампанія па скліканню Народнага Сходу, якая ішла ў абставінах высокай палітычнай актыўнасці працоўных, але трэба адзначыць, што рашэнне аб скліканні такога сходу было прынята Цэнтральным камітэтам Усесаюзнай камуністычнай партыі (бальшавікоў) (ЦК УКП(б)) яшчэ 1 кастрычніка 1939 г. і абмеркавана на пасяджэнні Бюро ЦК Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі (КП(б)Б) на наступны дзень — таму ў Беластоку фактычна прадубліравалі папярэдняе рашэнне савецкага кіраўніцтва[31]. На шматлікіх мітынгах і сходах рабочыя, сяляне, інтэлігенцыя аднагалосна патрабавалі ўсталявання Савецкай улады ў Заходняй Беларусі і ўваходжання яе ў склад БССР.

Створаны з прадстаўнікоў Часовых упраў камітэт па арганізацыі вы-

[29] У. Ладысеў, *Аб'яднанне беларускай нацыі (да 65-годдзя ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР)*, „Беларускі гістарычны часопіс", 2004, № 9, с. 8.

[30] Л. Бибик, С. Третьяк, *Воссоединение Белоруссии*, „Армия", 1999, № 5, с. 28.

[31] А. Вабішчэвіч, *Уз'яднанне*, „Полымя", 2000, № 9, с. 196.

бараў зацвердзіў „Парадак арганізацыі выбараў Народнага Сходу Заходняй Беларусі”, у якім абвяшчаліся ўсеагульныя роўныя прамыя выбары пры патаемным галасаванні[32]. Такім чынам, афіцыйна праводжаныя выбары выглядалі значна больш дэмакратычнымі, чым за польскім часам, але на самой справе атрымалася зусім наадварот. Права вылучэння кандыдатаў мелі Часовыя ўправы, сялянскія камітэты, а таксама сходы рабочых прадпрыемстваў, рабочай гвардыі, інтэлігенцыі[33]. Палітычныя партыі (нават сацыялістычнага напрамку — Польская партыя сацыялістычная-лявіца і Бунд) ад удзелу ў выбарах адхіляліся.



*Сяргей Восіпавіч Прытыцкі*

На час выбарчай кампаніі арганізацыі КП(б)Б усходніх абласцей БССР узялі шэфства над ваяводствамі Заходняй Беларусі і накіравалі сюды, каб дабіцца неабходных вынікаў, тысячы агітатараў. У Заходнюю Беларусь было завезена 4 мільёны лозунгаў і лістовак, 43 000 плакатаў і амаль 100 000 партрэтаў кіраўнікоў УКП(б) і Савета Народных Камісараў (СНК) СССР. У гарадах адбываліся шматлюдныя мітынгі, прысутнічаць на якіх жыхары былі абавязаны. За кожным гарадскім раёнам, вуліцай і нават домам замацоўваўся работнік, які сачыў за палітычным настроем мясцовага насельніцтва, праводзіў з імі гутаркі і г.д.

Падчас падрыхтоўкі да выбараў заходнебеларускае насельніцтва атрымала нечаканы непрыемны сюрпрыз — без аніякіх кансультацый з прадстаўнікамі заходнебеларускай грамадскасці савецкі ўрад паводле савецка-літоўскай дамовы ад 10 кастрычніка 1939 г. перадаваў Літве Вільню і Віленскі край[34].

[32] I. Lubachko, *Belorussia under Soviet rule. 1917-1957*, Lexington 1972, p. 142.

[33] *Нарысы гісторыі Беларусі:* у 2 ч., ч. 2, рэд. М. П. Касцюк, Мінск 1995, с. 256.

[34] М. Іваноў, *Праблема прыналежнасці Вільні і беларускае нацыянальнае пытанне ў 1939 г.*, „Беларускі гістарычны часопіс”, 1999, № 3, с. 32-38; У. Ладысеў, *Аб’яднанне беларускай нацыі (да 65-годдзя ўз’яднання Заходняй Беларусі з БССР)*, „Беларускі гістарычны часопіс”, 2004, № 9, с. 12.

Выбары ў Народны Сход Заходняй Беларусі адбыліся 22 кастрычніка 1939 г. Заходнебеларускае насельніцтва было вельмі здзіўлена тым, што ў выбарчых бюлетэнях знаходзілася толькі адна кандыдатура, у той час калі „пры паляках" такіх кандыдатур заўсёды было некалькі. На выбарчых участках мелі месца факты зрыву чырвоных сцягоў і агітацыйных плакатаў, падпалу выбарчых участкаў, але ў цэлым выбары адбыліся — у іх удзельнічала 90,67% выбаршчыкаў.

У Народны Сход заходнебеларускае насельніцтва пад пільным кантролем з боку прадстаўнікоў Народнага камісарыята ўнутраных спраў (НКУС) абрала 926 дэлегатаў (з іх 121 жанчына): у тым ліку 563 сялян, 197 рабочых, 166 — з інтэлігенцыі і служачых (па нацыянальным складзе ў Сход трапіў 621 беларус, 127 палякаў, 72 яўрэі, 43 рускія, 53 украінцы і 10 прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей)[35].

Народны Сход Заходняй Беларусі праходзіў у Беластоку ў будынку гарадскога тэатра 28-30 кастрычніка 1939 г. і быў адкрыты па дакладзе старэйшага па ўзросце дэпутата Сцяпана Струга (Ваўкавыскі павет Беластоцкага ваяводства). Па дакладзе вядомага дзеяча заходнебеларускага нацыянальна-вызваленчага руху Сяргея Прытыцкага 29 кастрычніка 1939 г. дэлегаты аднагалосна (а як жа інакш!) прынялі Дэкларацыю аб абвяшчэнні савецкай улады на ўсёй тэрыторыі Заходняй Беларусі[36].

Вярхоўны Савет СССР на нечарговай V сесіі заслухаў 2 лістапада 1939 г. заяву Паўнамоцнай камісіі Народнага Сходу і пастанавіў задаволіць яе просьбу і ўключыць Заходнюю Беларусь у склад СССР з уз'яднаннем яе з БССР. 14 лістапада 1939 г. на нечарговай III сесіі Вярхоўны Савет БССР прыняў закон, паводле якога Заходняя Беларусь становілася часткай БССР. Тэрыторыя і колькасць насельніцтва БССР павялічыліся прыкладна ў два разы: з 125 600 км$^2$ да 225 600 км$^2$ і з 5,6 млн. чалавек да 10,3 млн. (з улікам Віленшчыны, якая ў лістападзе 1940 г. была перададзена Літве)[37].

Сесія даручыла Прэзідыуму Вярхоўнага Савета БССР прызначыць дзень выбараў у Вярхоўны Савет ад Заходняй Беларусі, вызначыць адміністрацыйнае дзяленне абласцей і раёнаў і прадставіць на зацвярджэнне Вярхоўнага Савета СССР праекты аб утварэнні новых абласцей, аб размежаванні раёнаў і абласцей паміж БССР і Украінскай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікай (УССР). 4 снежня 1939 г. Прэзі-

[35] С. Кобяк, А. Мацко, *Нелёгкая дорога к единению*, „Беларуская думка", 1999, № 8, с. 96.

[36] А. Вабішчэвіч, *Уз'яднанне*, „Полымя", 2000, № 9, с. 202; У. Ладысеў, *Ваенныя падзеі верасня 1939 г. у лёсе беларускага народа*, „Беларускі гістарычны часопіс", 1999, № 3, с. 11.

[37] М. Шумейка, *Уз'яднанне: верасень 1939 г. ...*, с. 108.

дыум Вярхоўнага Савета СССР прыняў указ, якім зацвердзіў прадстаўленне Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР аб утварэнні ў складзе рэспублікі Баранавіцкай, Беластоцкай, Брэсцкай, Вілейскай і Пінскай абласцей.

Партыйныя арганізацыі Кампартыі ў Заходняй Беларусі ствараліся занава, бо нягледзячы на актыўны ўдзел былых членаў КПЗБ у нацыянальна-вызваленчым руху і вялікую дапамогу ва ўсталяванні савецкай улады ў Заходняй Беларусі ў верасні-кастрычніку 1939 г., савецкі ўрад ставіўся да іх з недаверам. Былыя члены КПЗБ былі прыроўнены да выхадцаў з іншых партый і засталіся па-за Кампартыяй. Да чэрвеня 1941 г. у шэрагах УКП(б) уладамі было адноўлена з залікам перыяду знаходжання ў сваіх партыях толькі 46 былых членаў КПЗБ, КПЗУ і КПП, сярод іх Сяргей Прытыцкі, Рафаіл Сяржант, Уладзімір Царук, Захар Паплаўскі, Вера Харужая і іншыя[38].

Практычна на ўсе адказныя пасады ў апараце кіравання савецкі ўрад прызначаў накіраваных з Усходняй Беларусі партыйных і савецкіх работнікаў, чым значна падарваў аўтарытэт і прэстыж новай улады. Наркам унутраных спраў БССР Лаўрэнцій Цанава неаднаразова дакладваў сакратару ЦК КП(б)Б Панцеляймону Панамарэнку, што члены Часовых упраў зашмат увагі надаюць забеспячэнню сябе таварамі. Злоўжыванне службовым становішчам назіралася на самым высокім узроўні[39].

Такім чынам, верасень 1939 г. адыграў у лёсе беларускага народа вельмі складаную і супярэчлівую ролю. Па-першае, адбылося доўгачаканае ўз'яднанне беларускага народа, што было бясспрэчна станоўчым фактам. У Заходняй Беларусі масава адкрываліся беларускамоўныя школы і інстытуты, бібліятэкі, кінатэатры, бальніцы, ліквідавалася беспрацоўе. Па-другое, разам са станоўчымі абставінамі на тэрыторыі Заходняй Беларусі ўсталяваўся савецкі камандна-адміністратыўны рэжым з усімі яго недахопамі, праводзіліся гвалтоўная калектывізацыя сельскай гаспадаркі і прымусовая нацыяналізацыя прамысловасці, масавыя арышты і высылкі ў Сібір, Казахстан, на Поўнач і г.д. як прадстаўнікоў былой польскай адміністрацыі, буржуазіі, афіцэрства, леснікоў і асаднікаў[40], так і самых актыўных і аўтарытэтных удзельнікаў беларускага нацыянальна-вызваленчага руху: Антона Луцкевіча, Уладзіміра Самойлы, Вячаслава Багдановіча, Яна Пазняка, Адама Станкевіча і іншых.

[38] С. Кобяк, А. Мацко, *Нелёгкая дорога к единению*, „Беларуская думка", 1999, № 8, с. 97; У. Ладысеў, *Цяжкі шлях выпрабаванняў*, „Беларускі гістарычны часопіс", 1994, № 1, с. 88.
[39] *Гісторыя Беларусі:* у 6 т., т. 5: *Беларусь у 1917-1945*, с. 454.
[40] J. Stobniak-Smogorzewska, *Kresowe osadnictwo wojskowe 1920-1945*, Warszawa 2003, s. 285-287.

**Wital Harmatny** — magister nauk historycznych, od września 2007 r. wykładowca w Katedrze Nauk Społeczno-Humanistycznych Uniwersytetu Państwowego w Baranowiczach. Tematyka badań — historia chłopstwa w Zachodniej Białorusi (1921-1939), historia II wojny światowej, historia Berezy Kartuskiej i okolic. Autor ponad 20 prac naukowych opublikowanych w Białorusi, Polsce i Rosji

www.kamunikat.org